Паводле Канстытуцыі прэзідэнт краіны абіраўся тым жа парадкам, як і ў ЗША, аднак не на 4 гады, а на 6. Насуперак ідэалагічным уяўленням паводле Канстытуцыі пашыраліся і ўзмацняліся паўнамоцтвы прэзідэнта. Ён меў права звальняць і прызначаць міністраў і іншых службовых асоб, аднак у яго было адабрана права на перавыбрання [1].

Значную ўвагу аўтары Канстытуцыя надалі і правам штатаў. Ужо ў прэамбуле казалася аб іх прызнанні, аднак права на сецэсію, як і ў федэральнай Канстытуцыі, не згадвалася наогул. Штаты, але, атрымалі права адхілу ад адзейнасці ў парадку імпічменту тых прадстаўнікоў ураду, чыя сфера адказнасці знаходзілася цалкам у межах адпаведнага штата [1].

Канстытуцыя афіцыйна замацавала рабства: «Грамадзяне кожнага штата... маюць права прыязджаць і часова заставацца ў любым штаце... са сваімі рабамі і іншай уласнасцю». Кангрэсу забаранялася прымаць законы, якія парушалі б права ўласнасці на неграў, таксама былі зафіксаваны правілы прыёму новых штатаў у КША ў якасці рабаўладальніцкіх [1].

Змянялася норма прадстаўніцтва ў Палаце прадстаўнікоў, цяпер выбіраўся адзін прадстаўнік ад 50 тыс. чалавек. Кангрэс быў пазбаўлены права стымулявання прамысловасці краіны. Права рэгуляваць гандаль паміж штатамі і замежнымі дзяржавамі за Кангрэсам захоўвалася, аднак забаранялася фінасаваць гэта дзеля «унутраных паляпшэнняў» [1].

Вышэй былі пералічаны толькі асноўныя палажэнні галоўнага дакумента КША. Ягоныя аўтары не адыйшлі ад асноўных матываў Канстытуцыі ЗША, аднак змянілі і дадалі тое, што магло б быць карысным для існавання Канфедэрацыі.

### Літаратура

1 Конституция Конфедеративных Штатов Америки : пер. с англ. [Электронный ресурс] // Северная Америка. Век девятнадцатый. – Режим доступа: http://america-xix.org.ru/library/csa_constitution/. – Дата доступа: 19.03.2017.

***І. У. Ігнаценка***
*Навук. кіраўнік* ***В. П. Пічукоў,***
*канд. гіст. навук, дацэнт*

## “ВЫ РАСКУЛАЧВАЕЦЕ, А МЫ НЕ ПОЙДЗЕМ І ПАМАГАЦЬ”: СЯЛЯНСКІ СУПРАЦІЎ ПАЛІТЫЦЫ СУЦЭЛЬНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Курс на рэзкае фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі быў прыняты пасля лістападаўскага Пленума ЦК ВКП(б) 1929 года. Пагоня за высокімі тэмпамі калектывізацыі суправаджалася прымусовымі мерамі, адміністратыўным націскам на сялян [1, арк. 59]. Наступленне савецкай улады на сялянства, асабліва на яго заможную частку, суправаджалася масавымі хваляваннямі сялян. Не стала выключэннем і Гомельшчына. У палітычнай характарыстыцы Гомельскага раёну і акругі за 1930 год адзначалася аб адмоўных адносінах сялян да савецкай улады ў сувязі з калгасным будаўніцтвам і “ліквідацыяй кулацтва” [2, арк. 10–10 ад.]. Для абароны аднавяскоўцаў ад раскулачвання і высялення сяляне выкарыстоўвалі розныя сродкі: масавыя хадатайствы за адмену высялення, пагрозы ў адрас прадстаўнікоў савецкай улады, сілавыя сродкі [3, арк. 15–21].

Станоўчыя адносіны сялян да заможных гаспадароў вызваны тым, што апошнія дапамагалі больш слабым гаспадаркам (у эканамічным плане) пры неўраджаі, нейкіх



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

стыхійных бедствах [3, арк. 15–21]. Заможныя сяляне валодалі аўтарытэтам сярод аднавяскоўцаў. Акрамя таго, большая частка сялян была аб'яднана роднаснай сувяззю і не бачыла ў асобах заможных сялян ворагаў.

З другой паловы 1930 года колькасць сялянскіх выступленняў скарацілася. З восені 1930 года пачалася арганізацыя "новага прыліву" ў калгасы, узмацніўся падатковы гнёт, што выклікала незадаволенасць сялян. Аднак масавых хваляванняў, падобна вясновым, ужо не было.

## Літаратура

1 Всем секретарям райкомов «О ходе хлебозаготовок» // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (далей ДАГАГВ). Ф. 3. Воп. 1. Спр. 555. Арк. 59.

2 Политическая характеристика Гомельского района и округа (1930 г.) // ДАГАГВ. Ф. 205. Воп. 1а. Спр. 45. Арк. 10–10 ад.

3 Спецсводка № 34 Гомельского ОГПУ «Ход подготовки к выселению кулачества и политнастроение деревни в связи с этим» // ДАГАГВ. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 714. Арк. 15–21.

***Н. І. Казлова***
*Навук. кіраўнік* ***У. А. Ганчар,***
*канд. гіст. навук, дацэнт*

## ТАВАРЫСТВА "БЯЗБОЖНІК" 2-Й ГОМЕЛЬСКАЙ ЧЫГУНАЧНАЙ ШКОЛЫ ІІ СТУПЕНІ ІМЯ КАЛІНІНА

У савецкай дзяржаве антырэлігійная прапаганда з'яўлялася адной з галоўнейшых форм барацьбы за сацыялістычнае пераўтварэнне грамадства. Так, з канца 1922 г. з'яўляюцца цэнтральныя друкаваныя антырэлігійныя органы "Безбожник" і "Безбожник у станка", вакол якіх фарміруецца сетка антырэлігійных гурткоў па ўсёй дзяржаве [1, с. 164].

Так, з 1924 г. ёсць дадзеныя аб дзейнасці таварыства "Бязбожнік" 2-й Гомельскай чыгуначнай школы ІІ ступені імя Калініна. У дадзенай арганізацыі быў свой статут, у якім былі вызначаны мэты і задачы таварыства: "аб'яднаць пад знаменамі атэізму ўсіх праціўнікаў рэлігіі для арганізацыі актыўнай барацьбы за духоўнае распрыгоньванне працоўнага насельніцтва". Таварыства, згодна са статутам, павінна было займацца выдавецтвам літаратуры, накіраванай супраць рэлігіі; арганізоўваць і падтрымліваць антырэлігійную прапаганду і агітацыю; садзейнічаць укараненню новага побыту на аснове новай сацыялістычнай абраднасці.

Таварыства падзялялася на секцыі, адной з якіх быў антырэлігійны гурток. Узначальваў арганізацыю Савет, які прызначаў членаў прызідыума. Таварыства мела знамя і пячатку з гербам. Членам таварыства мог стаць кожны навучэнец і настаўнік, які адкрыта адмовіўся ад прыналежнасці да рэлігіі, прытрымліваўся статута і ўносіў членскія ўзносы, гадавы аб'ем якіх складаў 50 кап., з магчымасцю растэрміноўкі на 5 месяцаў [2, арк. 55].

Аднак, дадзенае таварыства не было зарэгістравана, як арганізацыя со сваім статутам. Гэта было звязана з тым, што ў ёй не значылася ні аднаго члена РКП(б). Так, пры дадзенай школе быў адчынены гурток антырэлігійнага характару, без магчымасці выдання літаратуры [3, арк. 50]. Трэба адзначыць, што пасля стварэння Саюзу Бязбожнікаў пабоднага роду арганізацыі былі рэарганізаваны ў ячэйкі Саюзу Бязбожнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ